БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 332(091)(470+571)“1861–1914”](043)+
94(470+571)“1861–1914”](043)

КАХНОВІЧ
Віктар Адамавіч

# ГАСПАДАРАННЕ Ў МАЁНТКАХ ПАЛЕСКАГА РЭГІЁНУ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў 1861 – 1914 гг.

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.03 – усеагульная гісторыя

Мінск, 2010

Праца выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце


Навуковы кіраўнік: **Яноўскі Алег Антонавіч**,
кандыдат гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Афіцыйныя апаненты: **Забаўскі Мікалай Міхайлавіч**,
доктар гістарычных навук, дацэнт, дэкан гістарычнага факультэта УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка»

**Жыхараў Сяргей Барысавіч**,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі славян і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта УА «Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны»

Апаніруючая арганізацыя: УА «Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А. А. Куляшова»


Абарона адбудзецца 25 сакавіка 2010 г. у 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.05 у Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасу: 220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, 8, аўд. 407.

Тэлефон навуковага сакратара: 227-45-11.
E-mail: menkovski@bsu.by

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы 23 лютага 2010 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
доктар гістарычных навук, прафесар В. І. Менькоўскі

# УВОДЗІНЫ

Ва ўмовах свабоднага рынкавага развіцця асаблівае значэнне набывае гаспадарчы вопыт папярэднікаў. Ён дае магчымасць прадбачыць поспех таго альбо іншага эканамічнага праекта і засцерагчы грамадства ад неапраўданых выдаткаў. Так, спробы вырашэння аграрнага пытання на мяжы XIX–XX стст. адыгралі істотнейшую ролю ў гістарычным лёсе Расійскай імперыі. У сваёй аснове гэтае пытанне было ўвасабленнем вострай эканамічнай і сацыяльнай сітуацыі ў тагачаснай Расіі. Калі сялянская гаспадарка была пераважна адсталая і неэфектыўная, то ўзнікае пытанне аб стане памешчыцкай гаспадаркі: ці была яна здольна павесці аграрны сектар і ўсю краіну да паспяховай буйной таварнай капіталістычнай вытворчасці, да агульнага эканамічнага ўздыму і мадэрнізацыі грамадства? Нельга не ўлічваць таго, што дваранства валодала вялікімі і лепшымі масівамі зямель у краіне, мела адукацыю, пэўныя капіталы і дзяржаўныя прэферэнцыі, а таксама некаторы вопыт передавога аграрнага і прадпрымальніцкага (уключаючы прамысловасць і гандаль) гаспадарання. Дадзеная акалічнасць, звычайна, недастаткова ўлічвалася ў гістарыяграфіі: памешчыцкая гаспадарка і землеўладанне разглядаліся, пераважна, як перашкода на шляху грамадскага прагрэсу.

У рамках прапанаванай працы гістарычныя працэсы ў эвалюцыі памешчыцкай гаспадаркі ў асаблівы перыяд капіталізму 1861–1914 гг. (ад скасавання прыгону да Першай сусветнай вайны) вывучаюцца на прыкладзе Палескага рэгіёну. Заўважым, што такі падыход запатрабаваны ў айчыннай гістарыяграфіі, у якой рэгіянальны кірунак даследаванняў прадстаўлены недастаткова. Разам з тым, урадам Беларусі ажыццяўляецца маштабная праграма развіцця Прыпяцкага Палесся на 2009–2015 гг. Звяртаючыся да гісторыі краю, трэба ўлічваць, што Палессе – гэта дастаткова вялікі трансгранічны і своеасаблівы рэгіён, трывалае вызначэнне якога замацавалася з часоў Расійскай імперыі, і беларуская ініцыятыва можа паслужыць як плённым прыкладам, так і заклікам да шматбаковага супрацоўніцтва ў эканамічным развіцці Палесся.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

### Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі

Даследаванне з'яўляецца часткай навуковай дзяржбюджэтнай тэмы «Внешнеполитические факторы в формировании и эволюции российской государственности в периоды Средневековья, Нового и Новейшего времени» НДП (навуковай даследчай працы) кафедры гісторыі Расіі БДУ, а таксама тэ-

мы НДП «Модернизация России (1861–1917 гг.): интеллектуально-идеологический аспект» па гранту № 40 БДУ на 2008 г.

**Мэта і задачы даследавання**

**Аб'ектам даследавання** з'яўляецца эканамічнае развіццё ў аграрным сектары Расійскай імперыі ў межах рэгіёну Палесся на працягу 1861–1914 гг. Дадзены перыяд вылучаецца на той падставе, што менавіта ён стаў па-свойму унікальным часам працякання мадэрнізацыйных працэсаў у Расійскай імперыі, у межах якой тады цалкам знаходзіўся Палескі рэгіён. З аднога боку, скасаванне прыгоннага права паставіла і дваранства (палітычна і эканамічна дамінуючае саслоўе імперыі), і сялянства (колькасна пераважаючае саслоўе імперыі) у новыя, капіталістычныя і рынкавыя ўмовы гаспадарання. З іншага боку, Першая сусветная вайна ўнесла ў гістарычныя працэсы, што абазначыліся на папярэднім этапе, радыкальныя карэктывы. Рэгіён Палесся абраны для даследавання на той падставе, што ён, па-першае, вылучаецца і агульнапрызнаны ў навуцы як адметны, акрэслены на падставе аб'ектыўных геаграфічных прыкмет, буйны рэгіён. Па-другое, таму, што, нягледзячы на маштабы рэгіёну, вывучэнню асаблівасцей яго развіцця не надавалася належная ўвага з боку гістарычнай навукі, за выключэннем этнаграфіі і археалогіі.

**Прадметам даследавання** з'яўляецца эвалюцыя гаспадарчых практык, умовы, асаблівасці і вопыт эканамічнай дзейнасці памешчыцкай гаспадаркі ў межах акрэсленых рэгіёну і перыяду. **Мэта** дадзенай працы – вызначэнне умоў, стану, тэндэнцый і вынікаў, асаблівых і падобных рысаў у эвалюцыі гаспадарання ў маёнтках памешчыкаў рэгіёну Палесся ў перыяд капіталістычнай трансфармацыі 1861–1914 гг.

Мэта запатрабавала вырашэння наступных **задач даследавання**:

1) Вызначыць стан і прасачыць развіццё гаспадаркі ў маёнтках на Палессі як на ўзроўні вылучэння агульнай рэгіянальнай спецыфікі, так і на аснове вывучэння асобных прыкладаў гаспадарання. Акрэсліць, сінтэзуючы атрыманыя вынікі праведзенага даследавання, кола найбольш істотных фактараў, што ўплывалі на гаспадаранне ў маёнтках на Палессі.

2) Вылучыць асаблівасці дваранскага (памешчыцкага) землеўладання на Палессі для перыяду 1861–1914 гг. з мэтай больш дасканалага аналізу характэрных рыс гаспадарання ў маёнтках даследуемага рэгіёну.

3) Выявіць і навукова абгрунтаваць галоўныя тэндэнцыі і вынікі ў гаспадарчым жыцці маёнткаў на Палессі перыяду 1861–1914 гг.

4) Зрабіць даказальны аналіз наяўнасці пэўнай структуры памешчыцкага гаспадарання, а таксама вызначыць, што ў найбольшай меры фарміравала эканамічны поспех у маёнтках на Палессі.



5) Ацаніць прадпрымальніцкую актыўнасць памешчыкаў рэгіёну Палесся, прымаючы да ўвагі назіранні датычна дваранскага гаспадарання ў іншых рэгіёнах імперыі.

Разам з тым, навізна і складанасць прадмета даследавання запатрабавалі вырашэння шэрага дадатковых задач: акрэсліць рэгіён даследавання; абазначыць тыя асаблівыя рысы сацыяльна-эканамічнага жыцця Палесся, што вызначаюцца ў гістарыяграфіі; акрэсліць кола гістарычных крыніц па тэме і правесці іх знешнюю і ўнутраную крытыку; прадставіць тыпалогію гаспадарання ў маёнтках на Палессі з мэтай вылучэння асаблівых і агульных рысаў у эканамічным жыцці рэгіёну.

Праца грунтуецца на прынцыпах гістарызму, навуковай аб'ектыўнасці, сістэмнасці і прынятага ў гістарычнай навуцы каштоўнаснага падыходу. Апроч агульналагічных метадаў выкарыстаны наступныя спецыяльныя метады гістарычнага пазнання: гісторыка-сістэмны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-кампаратыўны, гісторыка-генетычны. Таксама выкарыстаны інстытуцыянальны сацыялагічны метад для вывучэння змен у часе ў арганізацыі вотчыннага ўпраўлення Гомельскай вотчыны Паскевічаў, некаторых іншых буйнейшых землеўласнікаў, калі тое дазвалялі крыніцы. Разам з тым, пры вывучэнні статыстычных крыніц і бухгалтарска-ўліковых матэрыялаў былі прыменены інфармацыйныя тэхналогіі, колькасныя метады пазнання і рэканструкцыі гістарычнага працэсу.

**Палажэнні, вынесеныя на абарону**

Праведзенае даследаванне дазволіла вынесці на абарону наступныя палажэнні:

1) Сістэмна вылучаны фактары, што ўплывалі на гістарычны лёс палескага рэгіёну і вызначалі магчымасці памешчыцкай гаспадаркі на Палессі ў перыяд 1861–1914 гг. Так, устаноўлена, што якасна вызначальным і пераважным быў уплыў прыродна-геаграфічнага фактару, пераадоленне наступстваў якога вымагала вялікіх выдаткаў і негатыўна ўплывала на гаспадаранне ў краі. Гэты ж фактар абумоўліваў такія рысы гаспадарчага жыцця краю, як: раздробленасць угоддзяў, цераспалосіца, пашыранасць сервітутных угоддзяў і паўсюдная барацьба за сервітуты паміж сялянствам і памешчыкамі, вострая патрэба ў крэдыце і меліярацыі мясцовых гаспадарак. Падсумоўваючы вывучаны вопыт гаспадарання ў маёнтках рэгіёну, на другое месца па ўплыву можна паставіць такі суб'ектыўны фактар, як адносная схільнасць жыхароў Палесся да прадпрымальніцтва (лясныя промыслы, гандаль, іншае). Наступны фактар – сялянская рэформа 1861 г., наступствы якой аб'ектыўна павысілі выдаткі вытворчасці (хаця б з-за таго, што памешчыкі страцілі частку сваіх зямель і танныя рабочыя рукі прыгонных

сялян). Вялікі ўплыў на змены ў памешчыцкім гаспадаранні мелі меліярацыя і будаўніцтва чыгунак, якія істотна аслаблялі негатыўныя праявы першага адзначанага фактару. Замыкае групу найбольш уплывовых фактараў развіцця палескіх маёнткаў абмежавальная палітыка самадзяржаўя, што, хоць і стрымлівала гаспадарчую ініцыятыву пераважнай часткі мясцовых памешчыкаў, але не магла спыніць уласна гаспадарчую дзейнасць у маёнтках.

2) Устаноўлена, што на фоне ўсёй імперыі для Палесся быў характэрны дастаткова стабільны і выразны латыфундыяльны характар дваранскага землеўладання: латыфундыі складалі больш за 9/10 усяго дваранскага землеўладання, а таксама 2/5 (1877 г.), а затым 1/3 (1905 г.) да ўсяго зямельнага фонду ў рэгіёне. Асабліва моцна выяўленая асаблівасць характарызавала глыбінныя раёны Палесся (Пінскі, Мазырскі, Оўруцкі, Ровенскі паветы). Разам з тым, пэўная ўстойлівасць землеўладання на Палессі ўскосна сведчыла аб адноснай стабільнасці памешчыцкай гаспадаркі ў краі.

3) Устаноўлена (з дапамогай распрацаванай аўтарскай мадэлі эвалюцыі гаспадарчых практык у маёнтках на Палессі), што, агульна, назіраўся пераход ад тыпу гаспадарання з атрыманнем асноўнага даходу памешчыкаў ад здачы ў арэнду зямлі, прамысловых і гандлёвых аб'ектаў да пераважнага тыпу гаспадарання з атрыманнем асноўнага даходу ад нерацыянальнай эксплуатацыі лясоў. Пры гэтым адбывалася занядбанне і дэградацыя вытворчай базы маёнткаў.

4) Даследаванне гаспадарання ў палескіх маёнтках паказвае, што, хоць Палессе было пераважна аграрным краем, у найбольшай ступені гаспадарчы поспех залежыў ад прамысловай дзейнасці і лясной гаспадаркі. Так, больш за палову буйнейшых у краі латыфундый у якасці неабходнай умовы адноснага гаспадарчага поспеху мелі прамысловыя прадпрыемствы. Назіралася вядучая роля дваранскай прамысловасці на Палессі, аднак яна з часам саступала свае пазіцыі: у 1895 г. яе доля складала 3/4 , а ў 1910 г. – ужо толькі 1/2 ад прамысловай вытворчасці ў рэгіёне.

5) Выяўлена, што да 9/10 ад агульнага ліку землеўласнікаў і 3/5 для групы буйнейшых землеўласнікаў (з землеўладаннем больш за 5 тыс. дзес.) не мелі вынікаў паспяховай прадпрымальніцкай дзейнасці. Устаноўлена, што Палессе ў найбольшай ступені выяўляла падабенства з сітуацыяй, якая мела месца на тэрыторыі ўласна Беларусі, а таксама на Паўночным Захадзе Расіі (Пецярбургская, Ноўгарадская і Пскоўская губерні), у Прывісленскім краі, Прыбалтыцы і, па некаторых параметрах, на Урале.



**Асабісты ўклад суіскальніка**

Праведзена першае ў беларускай гістарыяграфіі даследаванне памешчыцкага гаспадарання ва ўмовах капіталістычнага развіцця на прыкладзе рэгіёну Палесся і ў сістэмным і інтэграваным выглядзе вылучаны, у рамках прадмета працы, спецыфічныя рысы рэгіянальнага гістарычнага развіцця.

Аўтарам прапанавана спецыяльная тыпалогія гаспадарчых практык у маёнтках рэгіёну для перыяду капіталістычнага развіцця 1861–1914 гг. Дадзеная тыпалогія носіць інструментальны характар. Яе даследчая эфектыўнасць апрабавана ў рамках дадзенай працы, і яна можа быць прапанавана для вывучэння памешчыцкай гаспадаркі ў далейшым.

Быў даследаваны шэраг фамільных фондаў архіваў Беларусі, Расіі і Украіны, што ўпершыню дазволіла прасачыць гістарычную дынаміку ў гаспадаранні Радзівілаў, Паскевічаў, Цярэшчанак (датычна маёнткаў у Жытомірскім павеце), П. Л. Вітгінштэйна, М. Л. Гогенлоэ, Горватаў, Яленскіх і іншых землеўласнікаў-дваран на Палессі. Таксама навізну ствараe ўвядзенне ў гістарыяграфічны зварот істотнага масіву новай гістарычнай інфармацыі фактычнага зместу, якая, разам з тым, мае карысны краязнаўчы і параўнаўча-аналітычны характар. Усё адзначанае пашырае гістарыяграфічныя здабыткі.

**Апрабацыя навуковых вынікаў дысертацыі**

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі прадстаўлены на міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях: Міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная 350-годдзю М. Д. Антуф'ева-Дзямідава, «Промышленная политика в стратегии российских модернизаций XVIII–XXI вв.» (Екацярынбург, чэрвень 2006 г.); Рэспубліканская навукова-тэарэтычная канферэнцыя «Актуальныя праблемы сацыяльнай гісторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.): да 90-годдзя Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.» (Мінск, 23 лютага 2007 г.); Міжнародная навукова-тэарэтычная канферэнцыя «Реформы и революции: процессы модернизации в Беларуси и других странах Европы» (Мінск, 25-26 кастрычніка 2007 г.); Міжнародная навукова-тэарэтычная канферэнцыя «Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья» (Віцебск, 19-20 красавіка 2007 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Методы исследований истории Беларуси: проблемы, достижения, перспективы» (Мінск, 22-23 кастрычніка 2008 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Беларусь: этапы станаўлення дзяржаўнасці (да 90-годдзя ўтварэння БССР)» (Мінск, 18 снежня 2008 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Сучас-

ныя тэндэнцыі развіцця гістарычнай навукі і адукацыі» (Мінск, 25 верасня 2009 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Вынікі даследавання апублікаваны ў 5 навуковых артыкулах у рэцэнзуемых навуковых выданнях, што адпавядаюць пункту 18 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і наданні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь, з агульным аб'ёмам 2,04 аўтарскія аркушы [2; 3; 4; 5; 6]. Таксама вынікі даследавання апублікаваны ў адным артыкуле ў зборніку навуковых прац і ў 7 матэрыялах выступленняў (тэзісаў, артыкулаў) на канферэнцыях з агульным аб'ёмам 2,17 аўтарскіх аркушаў [1; 7; 8; 9; 10; 11; 12; 13].

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з пераліку ўмоўных абазначэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі працы, трох главаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса і дадаткаў (39 табліц і 3 асобныя дадаткі). Поўны аб'ём дысертацыі складае 220 старонак. Тэкст дысертацыі складае 115 старонак, бібліяграфія – 41 старонку, дадаткі – 64 старонкі. Бібліяграфічны спіс уключае 556 адзінак выкарыстаных крыніц, у тым ліку 247 адзінак захоўвання архіўных матэрыялаў, 13 аўтарскіх публікацый.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ПРАЦЫ

У **першай главе** працы **«Гістарыяграфія, крыніцы, метадалогія даследавання»** аўтар ажыццявіў аналіз гістарыяграфіі па праблеме, ахарактарызаваў базу крыніц і вызначыў метадалагічны апарат даследавання.

Раздзел 1.1 **«Гістарыяграфія»**. Разглядаецца дарэвалюцыйная, савецкага часу і сучасная (навейшая) гістарыяграфія. На першым этапе яе развіцця вылучаны радыкальны (марксісцкая, народніцкая і ліберальная літаратура) і кансерватыўны кірункі ў гістарыяграфіі – у залежнасці ад прыхільнасці аўтараў або да ліквідацыі (частковай ці поўнай), або да захавання памешчыцкага землеўладання. У рамках дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі былі закладзены асноўныя пазіцыі ў разглядзе пытання аб памешчыцкай гаспадарцы ў наступны час. Гэты пласт гістарыяграфіі разнастайны і неаднародны па свайму складу. Істотнейшы ўплыў на гістарыяграфію аказалі аўтары марксісцкай арыентацыі: палажэнне У. І. Леніна аб тым, што буйное землеўладанне з'яўлялася базавай умовай буйной аграрнай капіталістычнай вытворчасці[1]. Насуперак, аўтары народніцкай арыентацыі (М. П. Аганоўскі, А. І. Антановіч, князь А. І. Васільчыкаў, інш.) лічылі, што буйная гаспадарка

[1] Ленин, В.И. Капитализм в сельском хозяйстве (О книге Каутского и о статье Булгакова) / В.И. Ленин // Полное собрание сочинений: в 55 т. – 5-е изд. – М.: Госполитиздат, 1958–1965. – Т. 4. 1898 – апрель 1901 г. – 1959. – С. 95–152.



знікне, а будучыня належыць дробнай сялянскай гаспадарцы[1]. Увагу прыцягвае праца А. І. Васільчыкава, дзе ўпершыню вызначана рэгіянальная спецыфіка ў развіцці памешчыцкай гаспадаркі і адзначаны некаторыя асаблівыя рысы Палесся[2]. Прадстаўнікі ліберальнага кірунку (А. А. Кауфман, С. М. Пракаповіч, А. А. Мануілаў, інш.) вагаліся, але схіляліся, у цэлым, да экспрапрыяцыі прыватнаўласніцкіх зямель на карысць сялян. Вялікую ўвагу прыцягвае праца прадстаўніка кансерватыўнага кірунку К. Ф. Галавіна, што была прысвечана буйному землеўладанню ў Расіі і Еўропе[3].

У гістарыяграфіі савецкага часу пераважна даследавалася сялянская гаспадарка, а гаспадарка памешчыцкая разглядалася праз прызму палажэнняў аб класавай барацьбе. Асабліва гэта было ўласціва для савецкай гістарыяграфіі ў 1920–1940-я гг. У пасляваенны ж час назіралася пашырэнне праблемнага поля даследаванняў. Выключнае значэнне захоўваюць працы А. М. Анфімава, Л. П. Мінарык, І. Д. Кавальчанкі, В. П. Цяпліцкага і Л. П. Ліпінскага, дзе разглядалася памешчыцкая гаспадарка ў Расіі[4]. Разам з тым, вызначэнне спецыфічных рысаў гістарычнага развіцця гаспадаркі на Палессі (неспрыяльныя прыродныя ўмовы, выразны латыфундызм дваранскага землеўладання, раздробленасць угоддзяў, цераспалосіца, інш.) было ўласціва для беларускай гістарыяграфіі. Такога падыходу прытрымліваўся яшчэ М. В. Доўнар-Запольскі[5]. Таксама і ў польскай гістарыяграфіі, пачынаючы з прац

[1] Антонович, А.И. Вопросы земледельческой промышленности и дворянского землевладения в России / А.И. Антонович. – М.: Тип. Тов-ва тип. А.И. Мамонтова, 1898. – С. 42–52; Васильчиков, А., кн. Землевладение и земледелие в России и других европейских государствах: в 2 т. / А. Васильчиков, кн. – СПб.: Тип. М. Стасюлевича, 1876. – Т. 2. – С. 570–585; Огановский, Н.П. Закономерность аграрной эволюции: в 3 ч. / Н.П. Огановский. – Саратов: Электро-типо-литография Б.Л. Рабинович, 1900–1913 гг. – Ч. 2. Теории капиталистического развития. Общий ход и фазы аграрной эволюции. – 1911. – С. 379–399.

[2] Васильчиков, А., кн. Землевладение и земледелие в России… Т. 2. – С. 640–647.

[3] Головин, К. Крупное землевладение в Западной Европе и России / К. Головин. – М.: Университетская типография (М. Каткова), 1887. – С. 8, 57.

[4] Анфимов, А.М. Крупное помещичье хозяйство Европейской России. (Конец XIX – начало XX века) / А.М. Анфимов. – М.: Наука, 1969. – 396 с.; Минарик, Л.П. Экономическая характеристика крупнейших земельных собственников в России конца XIX – начала XX в. (Землевладение, землепользование, система хозяйства) / Л.П. Минарик. – М.: Советская Россия, 1971. – 144 с.; Ковальченко, И.Д. Социально-экономический строй помещичьего хозяйства Европейской России в эпоху капитализма. Источники и методы изучения / И.Д. Ковальченко [и др.]; под ред. И.Д. Ковальченко. – М.: Наука, 1982. – 264 с.; Теплицький, В.П. Реформа 1861 року і аграрні відносини на України (60–90-і роки XIX ст.) / В.П. Теплицький. – Київ: Вид-во АН УССР, 1959. – 308 с.; Липинский, Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии. (Вторая половина XIX века) / Л.П. Липинский. – Минск: Наука и техника, 1971. – 256 с.

[5] Довнар-Запольский, М.В. Исследования и статьи: в 2 т. / М.В. Довнар-Запольский. – Киев: Тип. 1-й Киевской артели печатного дела, 1909. – Т. 1. Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность. – С. 440–448.

краязнаўцаў 1920–1930-х гг., адзначалася выразная спецыфіка Палескага рэгіёну[1].

На навейшым этапе ў гістарыяграфіі адзначаецца пашырэнне вывучэння гісторыі прадпрымальніцтва, у тым ліку памешчыцкага, а таксама рэгіянальнага і лакальнага аспектаў у гістарычных даследаваннях. Апошні, у прыватнасці, прадстаўлены ў працах, што былі прысвечаны гістарычнаму лёсу дваранскіх сядзіб на Берасцейшчыне, Л. М. Несцярчука і А. Т. Федарука[2]. Разам з тым, заставалася актуальным вывучэнне асаблівасцей развіцця памешчыцкай гаспадаркі на Палессі.

Раздзел 1.2 **«Крыніцы»**. Даследаванне абапіраецца на разнастайныя дакументальныя (заканадаўчыя, актавыя, справаводчыя, статыстычныя), а таксама апавядальныя крыніцы і некаторыя матэрыялы перыёдыкі дарэвалюцыйнага часу. Дастаткова вялікая ўвага была звернута, у сілу спецыфікі праблемнага поля даследавання, на статыстычныя крыніцы, а таксама на матэрыялы дваранскіх фамільных архіўных фондаў Беларусі (у Мінску: 694 – Радзівілы, 986 – Горваты, 1636 – Яленскія, 2461 і 3030 – Чарнышовы, 3013 – Паскевічы; у Гродна: 485 – Булгарыны, 1325 – Скірмунты), Расіі (Санкт-Пецярбург: 892 – Балашовы, 899 – Бабрынскія) і Украіны (Кіеў: 49 – Патоцкія, 239 – Грахольскія, 240 – Аскеркі, 249 – Гіжыцкія, 257 – Радзівілы, 830 – Цярэшчанкі, 2216 – Цярлецкія, 2219 – Міхайлоўскія і Ерлічы, іншыя).

Раздзел 1.3 **«Метадалогія даследавання»**. Праца грунтуецца на прынцыпах гістарызму, навуковай аб'ектыўнасці, сістэмнасці і прынятага ў гістарычнай навуцы каштоўнаснага падыходу. У даследаванні прымяняліся філасофска-лагічныя метады – праца з асобнымі гістарычнымі крыніцамі, палажэннямі і фактамі гістарыяграфіі. Выкарыстоўваліся спецыяльныя гістарычныя метады даследавання: гісторыка-генетычны метад – для развіцця выяўленых сувязей гістарычных з'яў; гісторыка-сістэмны метад – памешчыцкая гаспадарка разглядалася як сістэма на рэгіянальным і лакальным узроўнях, што падвержана зменам; гісторыка-тыпалагічны метад – разглядаліся тэрытарыяльна-прасторавыя асаблівасці ў мінулым; гісторыка-кампаратыўны метад – параўнанне гістарычнай сітуацыі ў розных маёнтках Палесся з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі. Пры разглядзе арганізацыі вотчыннай адміністрацыі ўзнікла неабходнасць звярнуцца да

[1] Tomaszewski, Jerzy. Z dziejów Polesia. 1921–1939. Zarys stosunków spoleczno-ekonomicznych / Jerzy Tomaszewski. – Warszawa: Panstwowe Wydawnictwo Naukowe, 1963. – 210 s.; Jasiewicz, Krzysztof. Zagłada polskich Kresów. Ziemianstwo polskie na Kresach Połnoczno-Wshodnich Rzeczypospolitej pod okupacja sowiecką 1939–1941 / Krzysztof Jasiewicz. – Warszawa: VOLUMEN, 1998. – 359 s.

[2] Несцярчук, Л.М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) / Л.М. Несцярчук. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – 336 с., іл.; Федорук, А.Т. Старинные усадьбы Берестейщины / А.Т. Федорук. – 2-е изд. – Мн.: БелЭн, 2006. – 576 с., ил.



інстытуцыянальнага метаду – вотчыннае ўпраўленне разглядалася як адмысловая інстытуцыя са своеасаблівымі функцыямі, што змяняюцца з часам. У працы шырока выкарыстоўваліся колькасныя метады. Прапанавана аўтарская інструментальная тыпалогія гаспадарання ў маёнтках рэгіёну на падставе вылучэння прыярытэтных галін па атрымоўваемаму даходу.

Раздзел 1.4 **«Вынікі»**. Вылучаны агульныя рысы гістарыяграфіі: фіксацыя спецыфічных рыс гістарычнага развіцця на Палессі ў беларускай і польскай гістарыяграфіях, запатрабаванасць і пашырэнне на сучасным этапе вывучэння гісторыі прадпрымальніцтва, рэгіянальнай і лакальнай гісторыі. Адзначаюцца асаблівасці базы крыніц па тэме, у тым ліку збядненне масіваў дакументаў дваранскіх фамільных фондаў у перыяд пасля 1861 г.

**У другой главе** працы **«Рэгіянальныя і субрэгіянальныя асаблівасці гаспадарання ў маёнтках на Палессі»** даследуюцца асаблівасці развіцця памешчыцкай гаспадаркі на рэгіянальным і субрэгіянальным узроўнях, вылучаюцца агульныя і адметныя рысы ў гістарычных працэсах перыяду ў рэгіёне Палесся ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі і агульнай сітуацыяй у еўрапейскай частцы Расійскай імперыі.

Раздзел 2.1 **«Палессе ў кантэксце сацыяльна-эканамічных працэсаў Расійскай імперыі ў перыяд 1861–1914 гг.»**. У працы падрабязна акрэслены межы рэгіёну Палесся на падставе сістэматызацыі звестак спецыяльнай літаратуры другой паловы XIX – пачатку XX ст. Да рэгіёну былі аднесены 23 паветы ў межах 8 губерань Расійскай імперыі, што прадстаўлена на аўтарскай карце і ў табліцах у дадатках да дысертацыі. Палессе было дастаткова буйным рэгіёнам: у рамках вылучаных для даследавання паветаў (сучасная тэрыторыя Украіны, Беларусі і Польшчы) яно займала 136 тыс. км². Плошча Беларусі, для параўнання, складае 207,6 тыс. км², а Нідэрландаў, Бельгіі і Люксембурга – да 75 тыс. км². Разам з тым, палескі край вылучаўся як дастаткова спецыфічны і адрозны ад іншых рэгіёнаў імперыі: нізінны (Папрыпяцце, прылеглыя і падобныя па вобліку мясцовасці басейны рэк: Заходні Буг, Вепш, Сож, Дзясна), балоцісты (да 1/4 плошчы), лясісты (звыш 1/2 плошчы), цяжкадаступны, з дрэннымі сельскагаспадарчымі ўгоддзямі, бедны.

На падставе матэрыялаў першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва ў Расійскай імперыі 1897 г. устаноўлена, што рэгіён адрозніваўся нізкім узроўнем урбанізаванасці (10 % пры 13,3 % па імперыі), аграрным характарам гаспадаркі (72,4 % занятага насельніцтва), але з адносна большай, чым у сярэднім па еўрапейскай частцы Расіі, вагой дваранства ў агульнай структуры насельніцтва (1,2 % і 0,9 % адпаведна). Вылучаюцца спецыфічныя рысы для глыбінных раёнаў Палесся (Мазырскі, Рэчыцкі, Оўруцкі, Радамысельскі і некаторыя іншыя паветы). Менавіта тут была найменшая доля дваранства пры

найбольш аграрным і сялянскім характары агульнай структуры насельніцтва і найбольш хуткім дэмаграфічным росце. Разам з тым, у дадзеным раздзеле акрэсліваюцца агульныя тэндэнцыі ў парэформенным развіцці (і ў пачатку XX ст.) маёнткаў у Расійскай імперыі, вылучаюцца найбольш істотныя рысы дадзенага працэсу ў рэгіянальным разрэзе (Украіна, Беларусь, Прывісленскі край, Урал, Палессе).

Акрэсліваюцца ўплыў на сацыяльна-эканамічнае жыццё рэгіёну абмежавальнага расійскага заканадаўства ў дачыненні да мясцовых «польскіх» памешчыкаў, а таксама (бегла) уплыў чыгуначнага будаўніцтва і меліярацыі, на што звяртаецца ўвага пры разглядзе асобных маёнткаў у трэцяй главе.

Раздзел 2.2 **«Памешчыцкае землеўладанне на Палессі»**. На падставе матэрыялаў Варшаўскага статыстычнага камітэта ўстаноўлена, што Холмшчына (Холмскае Палессе, 5 паветаў) адрознівалася ў межах Прывісленскага краю адносна больш пашыраным і стабільным характарам буйной дваранскай землеўласнасці. Даследаванне ж матэрыялаў Цэнтральнага статыстычнага камітэта імперыі (пазямельныя перапісы 1877 г. і 1905 г.) паказвае, што ў межах астатніх 18 палескіх паветаў працэс скарачэння дваранскай землеўласнасці адбываўся павольней (-10,3 %), чым у Прывісленскім краі (-26 %), на ўкраінскіх землях (-34,2 %), на Правабярэжнай Украіне (-16,2 %), у еўрапейскай частцы Расіі (-47,7 %). Адрознівалася ж Палессе (падобна да Урала, беларускай тэрыторыі і Правабярэжнай Украіны) ярка выражаным латыфундыяльным характарам землеўладання. Асабліва гэта датычылася глыбінных раёнаў Палесся.

Раздзел 2.3 **«Гаспадарчая ініцыятыва ў палескіх маёнтках»**. У дадзеным раздзеле падсумоўваюцца і прыводзяцца ў сістэму наяўныя ў гістарыяграфіі назіранні аб спецыфіцы гаспадарчага гістарычнага развіцця на Палессі. Апроч таго, на падставе даследавання шэрагу апавядальных і статыстычных крыніц вылучаюцца і аналізуюцца формы, тыпы і спосабы рэалізацыі гаспадарчай ініцыятывы памешчыкаў на Палессі. Так, прапанавана вылучэнне 3-х груп маёнткаў па ступені рэалізацыі гаспадарчай (прадпрымальніцкай) ініцыятывы. На падставе матэрыялаў зборніка «Вся Россия» і 2-га выпуску «Кратких справочных сведений о некоторых русских хозяйствах» прасочваецца адносна невялікая доля прадпрымальніцкіх гаспадарак сярод усіх маёнткаў у рэгіёне, а таксама засяроджанне прадпрымальніцкай гаспадарчай актыўнасці ў найбольш буйных валоданнях і цесная залежнасць гаспадарчага поспеху ад прамысловай дзейнасці ў маёнтках.

Раздзел 2.4 **«Прамысловае прадпрымальніцтва ў маёнтках на Палессі»**. На падставе матэрыялаў фабрычна-заводскай статыстыкі канца XIX – пачатку XX ст. прасочваецца развіццё дваранскай прамысловасці ў рэгіёне ў



агульным плане і па асобных галінах. Большасць дваранскіх прадпрыемстваў (звыш 95 %) знаходзілася ў вясковай мясцовасці. Усяго з'ява дваранскага прамысловага прадпрымальніцтва ахоплівала да 1/10 ад ўсіх маёнткаў у рэгіёне. Вылучаліся такія галіны дваранскай прамысловасці: лесапільная, вінакурная, таксама цукраварная на паўднёвай ускраіне краю і шкляная і фарфорава-фаянсавая галіны на Валынскім Палессі.

Раздзел 2.5 "**Эксплуатацыя лясоў, «валынская практыка»**". На падставе апавядальных крыніц дапаўняецца вядомае ў гістарыяграфіі палажэнне аб выключнай ролі для памешчыкаў распрацоўкі лесу на Палессі. Падобная сітуацыя была на Урале, Паўночным Захадзе Расіі і на беларускіх землях. Апроч таго, вылучаецца асаблівая практыка на Валынскім Палессі, калі ў парэформенны час мясцовыя памешчыкі пачалі заахвочваць масавую нямецкую каланізацыю на сваіх землях, што спрыяла эканамічнаму прагрэсу.

Раздзел 2.6 **«Вынікі»**. Адзначана на падставе новага матэрыялу, што Палессе было аграрным краем з дамінуючым і адносна ўстойлівым і латыфундыяльным дваранскім землеўладаннем. Менавіта ў буйных маёнтках засяроджвалася гаспадарчая актыўнасць. Устаноўлена, што эканамічны поспех у найбольшай ступені залежыў ад прамысловай дзейнасці і лясной гаспадаркі. Выяўлена, што дваранства займала пераважную ролю ў прамысловасці рэгіёну, але павольна страчвала свае пазіцыі ў гэтай сферы.

У **трэцяй главе** працы **«Тэндэнцыі гаспадарання ў маёнтках на Палессі ў перыяд капіталістычнай трансфармацыі 1861–1914 гг.»** на падставе дакументаў дваранскіх фамільных архіўных фондаў вывучаны шэраг асобных прыкладаў гаспадарання. Вынікі назіранняў былі злучаны ў агульнай мадэлі эвалюцыі памешчыцкай гаспадаркі ў рэгіёне і інтэрпрэтаваны аўтарам.

Раздзел 3.1 **«Гаспадаранне ў маёнтках Радзівілаў»**. Прасочваецца гістарычная дынаміка ў эвалюцыі гаспадарання ў Алыцкай ардынацыі (поўдзень Луцкага і поўнач Дубенскага паветаў Валынскай губерні), у Давыд-Гарадоцкай ардынацыі (захад Мазырскага і паўднёва-ўсходняя ўскраіна Пінскага паветаў Мінскай губерні), у маёнтку Дзяніскавічы і некаторых іншых у Клецкай і Нясвіжскай ардынацыях (Слуцкі павет Мінскай губерні) Радзівілаў. Выяўляецца агульны заняпад гаспадаркі ў арандатараў фальваркаў, маёнткаў, прамысловых і гандлёвых аб'ектаў у валоданнях. У найбольшай ступені з 1870-х гг. даходы Радзівілаў пачалі залежаць ад лясной гаспадаркі. Паспяховая фальваркавая гаспадарка назіралася толькі ў асобных цэнтральных маёнтках. Вялізныя ж абшары землеўласнасці на Палессі выконвалі ролю сыравіннай перыферыі ўнутры валоданняў. Адзначым, што менавіта ўзмацненню эксплуатацыі лясоў служыла прыватная чыгунка Радзівілаў

Ганцавічы – Дзяніскавічы ў 1910–1915 гг. (тое ж назіралася ў маёнтку Нароўля Горватаў і ў маёнтку Ленін князя Вітгінштэйна).

Раздзел 3.2 **«Гаспадаранне ў маёнтках П.Л. Вітгінштэйна і М.Л. Гогенлоэ»**. Назіраліся, у цэлым, тыя ж тэндэнцыі, што і ў валоданнях Радзівілаў. Асабліва ярка яны прасочваюцца на прыкладзе палескіх валоданняў князя П. Л. Вітгінштэйна (Ленін, Лахва, Гарадзятычы і іншыя ў Мазырскім павеце Мінскай губерні). Так, назіралася ўзрастанне ролі даходаў ад эксплуатацыі лясоў і падзенне ролі паступленняў ад арандатараў маёнткаў, фальваркаў і іншых аб'ектаў нерухомасці. Як вынік, ужо на момант смерці князя П. Л. Вітгінштэйна ў 1887 г. асноўныя лясныя багацці яго валоданняў былі вычарпаны. Разам з тым, вялізарную і, бадай, невырашальную праблему для землеўласніка складаў канфлікт з чыншавай шляхтай, што змагалася за перадачу ёй ва ўласнасць арандуемых зямель, а таксама карумпаванасць і службовыя злоўжыванні вотчыннай адміністрацыі. З улікам усяго гэтага, а таксама хранічнай запазычанасці ўласнікаў, нежаданнем спадчыннікаў князя страчваць германскае падданства на карысць расійскага, у канцы XIX ст. разгарнуўся маштабны распродаж аднаго з найбуйнейшых латыфундыяльных валоданняў Расійскай імперыі і Еўропы.

Раздзел 3.3 **«Гаспадаранне ў Гомельскай вотчыне Паскевічаў»**. Вотчына ахоплівала амаль усю паўднёвую палову Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Падрабязным чынам была прааналізавана выкупная аперацыя ў Гомельскай вотчыне ў 1864–1866 гг., вынікі якой магчыма пашырыць на рэгіён Палесся. У 1870-я гг. назіраўся крызіс у фальваркавай гаспадарцы вотчыны, што было цесна звязана з неспрыяльнымі прыроднымі ўмовамі гаспадарання, з хранічнай нядбайнасцю арандатараў фальваркаў і іншых маёмасцей, са стратай цукровым заводам князя Паскевіча ў Гомелі сваіх пазіцый на рынку, а таксама з валам неплацяжоў і нядоімак сялянаў за арандуемыя і набытыя ўгоддзі. Выхад з сітуацыі быў дбайным уласнікам знойдзены – правядзенне шырокай меліярацыі ўгоддзяў у вотчыне, што было зроблена з дапамогай дзяржавы (1870–1880-я гг.), а таксама засяроджанне на лясной гаспадарцы і прамысловай дзейнасці (Добрушская папяровая фабрыка, лесапільныя заводы і сенапрэсавальны завод ва ўрочышчы Глушэц, з апорай на які развівалася лугаводства ў вотчыне).

Раздзел 3.4 **«Гаспадаранне ў палескіх маёнтках Цярэшчанак»**. Разглядаецца сітуацыя ў валоданнях (Чэрвонскае, Каравінецкае, Андрушэўскае) Цярэшчанак у Жытомірскім павеце Валынскай губерні. Тут назіраўся пераход у гаспадарчай практыцы ад пераважна прамысловага прадпрымальніцтва да гаспадарання, пры якім сумяшчаўся даход ад прамысловасці з даходам ад сельскай гаспадаркі ў эканоміях і ад арэнды



ўгоддзяў сялянамі, а таксама ад эксплуатацыі лясоў. Гэтая тэндэнцыя нарастала паралельна з пераўтварэннем Цярэшчанак у буйных латыфундыстаў і манапалізацыяй цукровай галіны.

Раздзел 3.5 **«Гаспадаранне ў маёнтках Горватаў, Яленскіх, Н.А. Бабрынскай і іншых уласнікаў»**. Разглядаецца шэраг асобных прыкладаў гаспадарання (Нароўля – Горватаў, Заказель-Белін – Бабрынскай, Чачэрск – Чарнышовых, Прывітаўка і Рэчыца – Цярлецкіх, іншыя), якія прадстаўлены ў крыніцах не паслядоўна, а эпізадычна. Выяўляецца агульная тэндэнцыя да заняпаду гаспадаркі ў фальварках і ўзрастанне ролі эксплуатацыі лясоў і прамысловай дзейнасці (асабліва вінакурэння) у даходах землеўласнікаў.

Так, у маёнтку Горватаў Нароўля назіраўся заняпад фальваркавай гаспадаркі. Асаблівае значэнне для ўласнікаў гэтага маёнтка атрымаў лес, для высечкі якога была пабудавана спецыяльная невялікая чыгуначная лінія. Даходы ад продажу дрэва дазволілі ўласнікам развіваць вінакурэнне ў Нароўлі, а таксама арганізаваць у пачатку XX ст. невялікі, але дастаткова паспяховы сенапрэсавальны завод. З'явілася магчымасць да развіцця лугаводства ў маёнтку. У валоданні Заказель-Белін, што ў 1893 г. графіня Н. А. Бабрынская набыла ў К. К. Ажэшкі, былі ажыццёўлены вялікія капіталаўкладанні ў перапрацоўчую прамысловасць. Было ўстаноўлена, што ў 1910 г. у Заказелі дзейнічаў буйнейшы спіртзавод у рэгіёне. Між тым, занядбаная гаспадарчая інфраструктура ў маёнтку, што засталася ад ранейшых уласнікаў, і неспрыяльныя ўмовы мясцовасці паглынулі фінансавыя магчымасці графіні і не дазволілі пабудаваць паспяховую камерцыйную гаспадарку.

Раздзел 3.6 **«Вынікі»**. Прадстаўлена агульная мадэль эвалюцыі гаспадарання ў маёнтках на Палессі, што паказвае пераход ад пераважнага арэнднага землекарыстання (земляробства і жывёлагадоўля, дзейнасць гандлёвых і дробных прамысловых аб'ектаў) да пераважнага засяроджання ўласнікаў маёнткаў на нерацыянальнай эксплуатацыі лясоў.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

Падсумоўваючы, вылучаюцца наступныя вынікі працы:

1) Упершыню сістэмна вылучаюцца асаблівасці гістарычнага развіцця на Палессі ў 1861–1914 гг. Вылучаюцца наступныя фактары ў эканамічным стане рэгіёну і памешчыцкага маёнтка:

а) На першае месца па ўплыву варта паставіць фактар спецыфічнага прыроднага асяроддзя. Апроч таго, што дадзенае меркаванне падтрымлівалася ў гістарыяграфіі (К. Ясевіч, Ю. Тамашэўскі, М. В. Доўнар-Запольскі, М. Б. Фрыдман, В. П. Панюціч, В. М. Бусько, інш.) і падзялялася сучаснікамі выву-

чаемага перыяду (І. І. Жылінскі, І. В. Лявіцкі, К. Забелін, Ц. І. Асадчы, інш.), яно вынікае з разляду асобных гаспадарак у рэгіёне. Так, у межах Давыд-Гарадоцкай ардынацыі Радзівілаў да 73 % плошчы займалі няўдобіцы – забалочаныя абшары. Абмяжоўвалі ўмовы мясцовасці гаспадаранне ў маёнтках Горватаў, у маёнтках Вітгінштэйна (Ленін, Лахва, іншыя), у Каравінецкім маёнтку Цярэшчанкі, у маёнтках Яленскіх, у Гомельскай вотчыне Паскевічаў (дзе да 1880-х гг. забалочаныя масівы складалі звыш 70 % плошчы). Непасрэдна дадзеная акалічнасць знайшла ўвасабленне ў нізкіх ураджаях, вымаканні пасеваў, эпізаотыях, дрэннай якасці кармоў для жывёлы. Гэты ж фактар вызначаў такія рысы краю, што спарадычна прасочваюцца ў гістарыяграфіі (беларускай і польскай, часткова – украінскай, асабліва сучаснай), як: раздробленасць угоддзяў, цераспалосіца, пашыранасць сервітутных угоддзяў і паўсюдная барацьба за сервітуты між сялянствам і памешчыкамі, вострая патрэба ў крэдыце і меліярацыі мясцовых гаспадарак.

б) На другое месца можна паставіць традыцыйную схільнасць жыхароў краю да прадпрымальніцтва. Яна адзначалася як сучаснікамі (І. В. Лявіцкі, Ч. Пяткевіч, іншыя), так і, часткова, у гістарыяграфіі (А. А. Несцярэнка, К. Р. Воблы, М. Б. Фрыдман, Л. П. Ліпінскі, інш.). Тое ж рэпрэзентуе вылучаная і разглежданая ў другой главе «валынская практыка», а таксама прыклады – з рознай ступенню паспяховасці – эканамічнай дзейнасці Паскевічаў, Цярэшчанак, Радзівілаў, Горватаў і інш. Можна сцвярджаць, што дадзеная схільнасць лагічна следуе з геаграфічных умоваў краю, якія вымушалі да пошуку неабходных рэсурсаў, да выхаду за межы стэрыятыпаў «дваранскага вобразу жыцця». Гэтая ж пэўная прадпрыемлівасць уплывала на адносную стабільнасць памешчыцкага землеўладання ў рэгіёне Палесся.

в) Істотным фактарам быў ўплыў сялянскай рэформы 1861 г.: яна пазбавіла вотчыннікаў даходаў ад чыншу, які пераважаў у буйных землеўладаннях на малапрыдатным для развіцця фальварквай гаспадаркі Палессі (прыклад Альцкай і Давыд-Гарадоцкай ардынацый, Гомельскай вотчыны, інш.). Разам з тым, памешчыкі рэгіёну вымушаны былі пагадзіцца з пераходам у надзельнае сялянскае землеўладанне да 1/3 зямлі маёнткаў (у Пінскім, Мазырскім паветах – 1/5). Пасля скасавання прыгону выраслі выдаткі на арганізацыю гаспадаркі эканоміі, што прыводзіла да ўпадку гаспадаркі ў пасэсараў і ў вотчыннікаў (прыклады маёнткаў П. Л. Вітгінштэйна, Радзівілаў, іншых валоданняў).

г) Уплыў тэхнічных праектаў – меліярацыя, чыгунка. Дадзены фактар непарыўна звязаны з першым, бо і маштабнасць, і эканамічная эфектыўнасць прама залежалі ад памераў дзяржаўных ці іншых доўгатэрміновых



капіталаўкладанняў. Значэнне гэтага фактару выразна прасочваецца на прыкладзе Гомельскай вотчыны Паскевічаў і маёнтка Дзяніскавічы Радзівілаў.

д) Фактар абмежавальнай палітыкі царызму да мясцовага «польскага» (каталіцкага) дваранскага памешчыцкага асяродка і гаспадарання ў краі, што адзначалася самімі палескімі памешчыкамі і дастаткова шырока рэпрэзентавана ў гістарыяграфіі (С. М. Самбук, А. П. Жытко, Д. Бавуа, К. Гранёўскі, А. Раманоўскі, Т. Эпштэйн, інш.). Напрыклад, гэта быў той істотны фактар, што ствараў адносна больш спрыяльныя канкурэнтныя ўмовы для гаспадаркі Цярэшчанак і Ф. І. Паскевіча, якія не адчувалі, падобна Радзівілам, ціску з боку дзяржавы [1; 3; 4; 5; 6; 7; 8; 9; 10; 11; 12; 13].

2) Устаноўлена, што на фоне ўсёй Расійскай імперыі рэгіён Палесся адрозніваўся ўстойлівасцю дваранскага землеўладання: з 1877 г. па 1905 г. яно скарацілася на 10,3–13,7 %, і працэс ішоў нават больш павольна, чым у цэлым на заходніх тэрыторыях імперыі (Прывісленскі край, Украіна, Беларусь). Пры іншых роўных умовах, апошняе сведчыла аб адноснай стабільнасці памешчыцкай гаспадаркі ў рэгіёне. Адрозніваўся рэгіён Палесся і ярка выражаным латыфундыяльным характарам памешчыцкага землеўладання. Латыфундыі ахоплівалі больш за 9/10 дваранскай зямлі. У 1877 г. яны складалі 2/5, а ў 1905 г. – 1/3 усяго зямельнага фонду ў рэгіёне. Устаноўлена, што прадпрымальніцкая актыўнасць канцэнтравалася ў буйнейшых валоданнях. У найбольшай ступені вылучаліся стабільнасцю і латыфундызмам дваранскага землеўладання глыбінныя паветы Палесся: Мазырскі, Пінскі, Оўруцкі, Ровенскі [4; 5; 6; 11].

3) Пабудаваная мадэль эвалюцыі гаспадарання ў маёнтках на Палессі ў перыяд 1861–1914 гг. паказвае, што, агульна, назіраўся дрэйф у гаспадарчых практыках уладальнікаў маёнткаў на Палессі ад пераважнага атрымання даходу ад пасэсарскага арэнднага трымання зямлі і прамысловых і гандлёвых аб'ектаў да засяроджання на драпежніцкім вынішчэнні лясоў. Назіралася занядбанне і дэградацыя вытворчай базы маёнткаў. Асабліва выразна адлюстроўвае гэта прыклад маёнткаў П. Л. Вітгінштэйна, Цярлецкіх, палескіх валоданняў Радзівілаў, іншых маёнткаў [4; 6; 9; 12; 13].

Падмацоўваецца дадзенае палажэнне і назіраннем, што было зроблена на падставе вывучэння фамільных дваранскіх фондаў як цэласных сістэмных масіваў і аб'ектаў даследавання. Выяўлена, што ўнутраныя прычыны заняпаду панскай гаспадаркі знаходзілі выразнае знешняе ўвасабленне ў матэрыялах фондаў: у параўнанні з перыядам існавання прыгоннага права ўбываюць, у цэлым, колькасна і якасна масівы дакументаў дваранскіх землеўласніцкіх фамільных фондаў [2].

4) Адзначаецца, на падставе новага матэрыялу, што Палессе было аграрным краем з пераважным значэннем земляробства. Традыцыйна ў маёнтках рэгіёну (буйных, як правіла) было пашырана гаспадаранне арандатараў-пасэсараў і іздольнае землекарыстанне сялянаў, а таксама лясныя промыслы. Прагрэс у сельскай гаспадарцы вызначала звяртанне ў земляробстве да насенневай гаспадаркі, садаводства, агародніцтва, вырошчвання тэхнічных культур і кармавых траваў. Апошняе было цесна звязана з прадпрымальніцкай жывёлагадоўляй (мясной, племянной, малочнай). У некаторых выпадках (прыклад Нароўлі Горватаў і Гомельскага маёнтка Паскевічаў) самастойнае таварнае значэнне атрымала лугаводства. Аднак, у сілу натуральных абставін, сельская гаспадарка, у цэлым, не станавілася фактарам эканамічнага поспеху мясцовых памешчыкаў.

Даследаванне дазволіла выявіць, што ва «ўзорных» (рэпрэзентаваных як лепшыя гаспадаркі па меркаванню сучаснікаў) і буйнейшых (з больш чым 5 тыс. дзес.) маёнтках, а таксама ў асобных гаспадарках (Паскевічаў, Радзівілаў, Цярэшчанак, Н. А. Бабрынскай, інш.) назіралася моцная залежнасць эканамічнага поспеху ад прамысловай дзейнасці і лясной гаспадаркі. Так, болей 1/2 буйнейшых у краі латыфундый, як неабходная ўмова адноснага гаспадарчага поспеху, мелі прамысловыя прадпрыемствы. Аднак прамысловая дзейнасць ахоплівала не болей 1/10 маёнткаў на Палессі. Разам з тым, назіралася вядучая роля дваранскай прамысловасці на Палессі, якая з часам саступала свае пазіцыі: у 1895 г. – 50,8 % прадпрыемстваў, 71,7 % вытворчасці, 70 % рабочых; у 1910 г. – 45,25 %, 50,7 %, 40 % адпаведна. Такім чынам, дваранская прамысловасць скарацілася за адзначаны перыяд на 1/3. Галоўнымі былі вінакурная, цукровая, лясная, а таксама шкляная і фарфорава-фаянсавая галіны прамысловасці. Назіралася замаруджанне тэмпаў развіцця, апроч як у вінакурэнні [3; 4; 5; 6; 11].

Лясная гаспадарка, як адзначалася, пераважна вялася па-драпежніцку: паўсюдна ішло вынішчэнне лясоў (прыклад маёнткаў Горватаў, Цярлецкіх, П. Л. Вітгінштэйна і нават Ф. А. Цярэшчанкі, інш.). Толькі адносна невялікая колькасць маёнткаў (найперш Гомельская вотчына Паскевічаў) дэманстравала сабой прыклад рацыянальна пастаўленай паспяховай лясной гаспадаркі [6].

5) Праведзенае даследаванне дазволіла выявіць, што да 9/10 агульнага ліку памешчыкаў і 3/5 буйнейшых латыфундыстаў (ад 5 тыс. дзес.) не праяўляюць рыс прадпрымальніцкай паспяховай рынкавай таварнай актыўнасці. Аналіз гаспадарчай ініцыятывы палескіх памешчыкаў, паводле вылучаных аўтарам груп (класаў) маёнткаў, дазволіў устанавіць, што прадпрымальніцкая актыўнасць засяроджвалася ў буйнейшых маёнтках краю. Гэта прама можна звязваць як з наяўнасцю магчымасцей увядзення ў



гаспадарчую практыку навацый, так і з тым, што пераадоленне ўмоваў мясцовасці патрабавала вялікіх інвестыцый. Менавіта прамая дзяржаўная падтрымка, разам з працяглымі капіталаўкладаннямі, гаспадарчай настойлівасцю і руплівасцю, апчаднасцю да вытворчай базы маёнткаў, – дазволіла ўласнікам Гомельскай вотчыны дасягнуць вялікіх эканамічных поспехаў [2; 4; 6; 11; 13].

Вызначана, што па ўмовах мясцовасці Палессе ў найбольшай ступені адпавядала сітуацыі ў Беларусі і на Паўночным Захадзе Расіі. Па стану ж землеўладання і асаблівасцям памешчыцкага гаспадарання назіралася падабенства з Правабярэжнай Украінай, Беларуссю, Прывісленскім краем, Прыбалтыкай, а таксама (латыфундызм, роля дваранскай прамысловасці і эксплуатацыі лясоў) з рэгіёнам Урала [2; 3; 4; 5; 6; 11; 13].

**Рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню вынікаў**

Практычнае значэнне атрыманых вынікаў даследавання заключаецца ў магчымасці іх выкарыстання ў працы розных грамадскіх структур, устаноў гуманітарнага і культурнага супрацоўніцтва, а таксама ва ўстановах адукацыі, што вядуць вывучэнне гісторыі Расіі (Расійскай імперыі), Беларусі, Украіны, Польшчы, што праводзяць рэгіянальныя і трансгранічныя даследаванні, даследаванні гісторыі народнай гаспадаркі і вопыту прадпрымальніцкай дзейнасці. Відавочны карысны характар працы заключаецца ва ўвядзенні ў гістарыяграфічны зварот многіх архіўных матэрыялаў, што дапаўняе наяўную інфармацыйную базу гістарычнай навукі. Разам з тым, дадзеная праца можа стаць асновай пры стварэнні спецыяльных курсаў па эканамічнай і сацыяльнай гісторыі ў рамках спецыялізацыі «ўсеагульная гісторыя» (гісторыя Расіі і Украіны), «айчынная гісторыя», пры стварэнні вучэбных і спецыяльных прац аб Палессі краязнаўчага плана, а таксама музейных экспазіцый.

Дадзенае даследаванне можа быць карысным як дапаможны матэрыял у справе бізнес-праектавання і бізнес-планавання ў сферы аграрнага і краявога турызму ў кірунку «этнаграфія памешчыцкага маёнтка». Таксама можа быць выкарыстаны і прадстаўлены ў дысертацыі вопыт гаспадарання ў палескіх маёнтках для ўліку магчымых сучасных рызыкаў гаспадарчай дзейнасці ва ўмовах спецыфічнага ў прыродна-кліматычных адносінах рэгіёну Палесся.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Артыкулы ў навуковых зборніках і часопісах**

1 Кахновіч, В.А. Аўгустоўскі, Агінскі і Днепра-Бугскі каналы як гідратэхнічныя і гістарычныя помнікі Беларусі / В.А. Кахновіч // Kanał Augustowski i współczesna ekoturystyka. (Августовский канал и современный экотуризм) / Akad. Humanist. im. Aleksandra Gieysztora w Pułtusku; red. nauk. W. Lenart i A. Zelenkov. – Pułtusk – Mińsk – Grodno, 2008. – S. 211–224.

2 Кахновіч, В.А. Матэрыялы «вотчынных архіваў» Беларусі як крыніца для вывучэння эканамічнага развіцця панскай гаспадаркі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / В.А. Кахновіч // Архівы і справаводства. – 2008. – № 6. – С. 108–113.

3 Кахновіч, В.А. Асаблівасці мадэрнізацыі памешчыцкай гаспадаркі на Палессі ў парэформенны перыяд Расійскай імперыі (1861–1914): рэгіянальная спецыфіка / В.А. Кахновіч // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. – Вып. 4 / рэдкал.: У.К. Коршук (адк. рэд) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2009. – С. 20–25.

4 Кахновіч, В.А. Асаблівасці памешчыцкага землеўладання і гаспадарання на Палессі ў парэформенны перыяд Расійскай імперыі (1861–1914 гг.) / В.А. Кахновіч // Веснік Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя І.П. Шамякіна. – 2009. – № 1. – С. 53–57.

5 Кахновіч, В.А. Асаблівасці развіцця дваранскага прамысловага прадпрымальніцтва на Палессі ў парэформенны перыяд (1861–1914 гг.) і некаторыя аспекты яго вывучэння ў беларускай і ўкраінскай гістарыяграфіі / В.А. Кахновіч // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 3. – 2009. – № 2. – С. 10–14.

6 Кахновіч, В.А. Тэндэнцыі гаспадарчай дзейнасці ў парэформенным маёнтку на Палессі / В.А. Кахновіч // Российские и славянские исследования: научн. сб. – Вып. 4 / редкол.: А.П. Сальков, О.А. Яновский (отв. ред.) [и др.]. – Минск: БГУ, 2009. – С. 116–123.

**Матэрыялы канферэнцый**

7 Кохнович, В.А. Освоение Полесья, государственный фактор: вт. пол. XIX – нач. XX ст. / В.А. Кохнович // Промышленная политика в стратегии российских модернизаций XVIII–XXI вв.: мат-лы Междунар. научн. конфер., посвящ. 350-летию Н.Д. Антуфьева-Демидова, Екатеринбург, 15–16 июня 2006 г.



/ ИВИ РАН УРО (Уральское отделение); редкол.: В.В. Алексеев (гл. ред.) [и др.]. – Екатеринбург, 2006. – С. 130–132.

8 Кахновіч, В. М.С. Грушэўскі аб гісторыі Берасцейшчыны / В. Кахновіч // Науково-історичні читання, присвячені 140-річчю з дня народження М.С. Грушевського, Мінськ, 22 грудня 2006 р. / БДУ; за заг. ред. О.А. Яновського і В.М. Бойка. – Ніжин, 2007. – С. 66–71.

9 Кахновіч, В.А. Немцы і яўрэі ў сацыяльнай прасторы Палесся канца XIX ст. / В.А. Кахновіч // Актуальныя праблемы сацыяльнай гісторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.): да 90-годдзя Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.: мат-лы Рэсп. навук.-тэар. канф., г. Мінск, 23 лютага 2007 г. / БДПУ імя М. Танка; рэдкал.: А.П. Жытко (навук. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2007. – С. 201–205.

10 Кахновіч, В. Гісторыя асваення Палесся (засяленне і меліярацыя): спрэчныя моманты гістарыяграфіі / В. Кахновіч // Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья: мат-лы Междунар. научн.-теорет. конфер., Витебск, 19–20 апреля 2007 г. / Вит. гос. ун-т им. П.М. Машерова; редкол.: В.А. Космач (гл. ред.) [и др.]: в 3 ч. – Витебск, 2007. – Ч. 1. – С. 31–35.

11 Кахновіч, В.А. Асаблівасці памешчыцкага прадпрымальніцтва на Палессі ў канцы XIX – пачатку XX ст.: метадалагічны і практычны аспекты / В.А. Кахновіч // Методы исследований истории Беларуси: проблемы, достижения, перспективы: мат-лы Междунар. научн.-практ. конфер., Минск, 22–23 октября 2008 г. / НАН Беларуси; редкол.: А.А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2009. – С. 76–80.

12 Кахновіч, В.А. Пытанне аб ахове ўласнасці і яго вырашэнне на прыкладзе Гомельскай вотчыны княгіні Паскевіч падчас першай расійскай рэвалюцыі 1905–1907 гг. / В.А. Кахновіч // Беларусь в современных геополитических условиях: политико-правовые и социально-экономические аспекты устойчивого развития: м-лы Республ. научн.-практ. конфер., г. Минск, 20 марта 2009 г. / Мин-во внутр. дел Республ. Беларусь, Академия МВД; под ред. М. Г. Знака: в 2 т. – Минск, 2009. – Т. 1. – С. 137–138.

13 Кахновіч, В.А. Немцы і гаспадаранне ў маёнтках на Палессі ў парэформенны перыяд / В.А. Кахновіч // III Машеровские чтения: м-лы Республ. научно-практ. конфер., Витебск, 24–25 марта 2009 г. / Вит. гос. ун-т им. П.М. Машерова; редкол.: А.Л. Гладков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2009. – С. 16–17.

## РЭЗЮМЭ

Кахновіч Віктар Адамавіч

**Гаспадаранне ў маёнтках Палескага рэгіёну Расійскай імперыі ў 1861–1914 гг.**

**Ключавыя словы**: памешчыкі, маёнткі, прадпрымальніцтва, землеўладанне, сельская гаспадарка, прамысловасць, лясная гаспадарка, тыпы гаспадарання, капіталізм, мадэрнізацыя, сялянская рэформа, Палессе, рэгіянальная гісторыя, лакальная гісторыя.

Аб'ектам даследавання з'яўляецца эканамічнае развіццё ў аграрным сектары ў перыяд 1861–1914 гг. у рамках рэгіёну Палесся. Прадметам даследавання з'яўляюцца ўмовы, асаблівасці і вопыт эканамічнай дзейнасці памешчыцкай гаспадаркі ў межах адзначаных перыяду і рэгіёну. Мэта дадзенай працы – вызначэнне стану, умоў, тэндэнцый і вынікаў, агульных і адрозных рысаў у эвалюцыі гаспадарання ў маёнтках у рэгіёне Палесся. Даследаванне было праведзена з дапамогай сістэмнага, гісторыка-тыпалагічнага, гісторыка-кампаратыўнага і колькасных метадаў пазнання і рэканструкцыі гістарычнага працэсу.

Вынікам працы стала выяўленне асаблівасцей у эканамічным развіцці рэгіёну. Устаноўлена, што да 1/10 маёнткаў мясцовых памешчыкаў можна аднесці да паспяховых прадпрымальніцкіх гаспадарак.

Навізна працы заключаецца ў тым, што ўпершыню на аснове шырокага кола архіўных крыніц (фамільных фондаў, у асноўным) было праведзена комплекснае даследаванне гаспадарчай дзейнасці ў маёнтках на Палессі ва ўмовах парэформеннага развіцця. Была распрацавана і ў даследчай практыцы апрабавана тыпалогія гаспадарчых практык у памешчыцкіх маёнтках для перыяду пасля адмены прыгоннага права.

Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні навуковых манаграфій, артыкулаў, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, спецыяльных курсаў па спецыяльнасці «айчынная гісторыя» і «усеагульная гісторыя» (гісторыя Расіі, Украіны), па краязнаўству, пры праектаванні музейных экспазіцый, пры бізнес-праектаванні і бізнес-планаванні ў сферы аграрнага і краязнаўчага турызму.



## РЕЗЮМЕ

Кохнович Виктор Адамович

**Хозяйствование в имениях Полесского региона Российской империи в 1861–1914 гг.**

**Ключевые слова:** помещики, имения, предпринимательство, землевладение, сельское хозяйство, промышленность, лесное хозяйство, типы хозяйствования, капитализм, модернизация, крестьянская реформа, Полесье, региональная история, локальная история.

Объектом исследования является экономическое развитие в аграрном секторе в период 1861–1914 гг. в рамках региона Полесья. Предметом исследования являются условия, особенности и опыт экономической деятельности помещичьего хозяйства в рамках указанных периода и региона. Цель данной работы – определение положения, условий, тенденций и результатов, особенных и сходных черт в эволюции хозяйственной деятельности в имениях в регионе Полесья. Исследование было проведено с помощью системного, историко-типологического, историко-компаративного и количественных методов познания и реконструкции исторического процесса.

Результатом работы стало выявление особенностей в экономическом развитии региона. Установлено, что до 1/10 имений местных помещиков можно отнести к успешным предпринимательским хозяйствам.

Новизна работы заключается в том, что впервые на основании широкого круга архивных материалов (фамильных фондов, в основном) было проведено комплексное исследование хозяйственной деятельности в имениях на Полесье в условиях пореформенного развития. Была разработана и в исследовательской практике испытана типология хозяйственных практик в помещичьих имениях для периода после отмены крепостного права.

Результаты диссертационного исследования могут быть использованы при написании научных монографий, статей, учебников и учебных пособий, специальных курсов по специальности «отечественная история» и «всеобщая история» (история России, Украины), по краеведению, при проектировании музейных экспозиций, при бизнес-проектировании и бизнес-планировании в сфере аграрного и краеведческого туризма.

## SUMMARY

Kohnovich Victor Adamovich

**Managing in manors of Polesie region of Russian empire in 1861–1914**

**Keywords:** landowners, manors, business, landed property, an agriculture, the industry, a forestry, types of managing, capitalism, modernization, country reform, Polesie, regional history, local history.

Object of research is economic development in agrarian sector during 1861–1914 within the limits of region of Polesie. A subject of the given research is conditions, features and experience of economic activities manor-facilities within the limits of the certain period and region. The purpose of the given work – definition of position, conditions, tendencies and results, especial and similar features in evolution of managing in manors in region of Polesie. Research has been lead by means of system, historical-typological, historical-comparative and quantitative methods of knowledge and reconstruction of historical process.

Result of work is revealing features in economic development of region. Comes to light, that up to 1/10 manors of local landowners it is possible to carry to successful business-facilities.

Novelty of work consists in the fact that for the first time on the basis of the broad audience of archival materials (basically – family funds) complex research of economic activities manors to Polesie in conditions of post-reform developments has been carried out. The typology of economic practice in patrimony manors for the period after abrogation of the serfdom has been developed and tested.

Results of dissertational research can be used at a writing of scientific monographies, clauses, textbooks and the grants, special rates on a speciality «domestic history» and «general history» (history of Russia, Ukraine), on study of local lore, at designing museum expositions, at business-designing and business-planning in sphere of agrarian and local lore tourism.



Падпісана да друку 15.02.2010. Фармат 60×84 1/16. Папера афсетная.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 1,5.
Тыраж 90 экз. Заказ 104.

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка
ў рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага універсітэта».
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.